# *§ 34–0. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця цывілізацый свету

**1. Змяненне характару і зместу знешняга гандлю еўрапейскіх дзяржаў.** У эпоху ранняга Новага часу (XVI–XVIII стст.) характар і змест знешняга гандлю еўрапейскіх краін зазналі істотныя змены. Гэтыя змены былі абумоўлены шэрагам фактараў, у тым ліку Вялікімі геаграфічнымі адкрыццямі, развіццём капіталізму, ростам мануфактурнай вытворчасці і ўзмацненнем каланіяльнай экспансіі.

Да XVI ст. галоўнымі гандлёвымі шляхамі Еўропы былі міжземнаморскія маршруты, якія кантраляваліся італьянскімі гарадамі — Венецыяй і Генуяй. Аднак пасля адкрыцця марскога шляху ў Індыю (1498 г., Васка да Гама) і Амерыкі (1492 г., Х. Калумб) цэнтр гандлю перамясціўся ў Атлантыку.

Партугалія і Іспанія першыя пачалі асвойваць новыя землі і паспрабавалі заняць пануючае становішча на шляхах сусветнага гандлю і ў калоніях. Яны заключылі дамовы, якімі размежавалі свае ўладанні ў Атлантычным і Ціхім акіянах. Аднак ужо ў другой палове XVI ст. іспана-партугальскай гандлёвай і каланіяльнай манаполіі кінулі выклік іншыя дзяржавы Заходняй Еўропы. Пасля таго як магутнасць іспанскай кароны была падарваная аддзяленнем ад яе Галандыі (Паўночных Нідэрландаў), што абвясціла ў 1581 г. незалежнасць, шмат якія дзяржавы Заходняй Еўропы сталі на шлях каланіяльных захопаў у Амерыцы, Афрыцы і Азіі.

У XVII ст. дзякуючы развітому флоту і гандлёвым кампаніям лідарамі сусветнага гандлю зрабіліся Нідэрланды і Англія. Першапачаткова поспех быў на баку галандцаў, яны заснавалі калоніі ў Паўднёвай

Афрыцы, на востраве Цэйлон і астравах Паўднёва-Усходняй Азіі. Дзякуючы гэтаму Нідэрланды на невялікі час зрабіліся галоўнай каланіяльнай імперыяй і найважнейшым у свеце марскім перавозчыкам тавараў. Аднак такое становішча выклікала незадаволенасць канкурэнтаў, асабліва Англіі. У 1651 г. брытанскі парламент зацвердзіў вядомы Навігацыйны акт, які пазней шмат разоў пацвярджаўся. Гэты заканадаўчы акт паўстаў нагодай для трох англа-галандскіх марскіх канфліктаў, вынікам якіх былі прызнанне Нідэрландамі акта і страта значнай часткі міжнароднага гандлю. Гэты акт дзейнічаў амаль два стагоддзі і страціў сваю сілу толькі ў 1849 г.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Фрагмент Навігацыйнага акта 1651 г.**

Для павелічэння гандлёвага флоту і заахвочвання мараплаўства нацыі, што дзякуючы добраму апекаванню і заступніцтву Божаму ёсць такім важным сродкам дабрабыту і бяспекі гэтай рэспублікі, сапраўдны парламент і яго ўлада маюць пастанавіць, што ад 1 снежня 1651 г. і надалей пасля гэтай даты ніякія прадукты і тавары, што растуць або вырабляюцца ў Азіі, Афрыцы і Амерыцы, або ў іх частках, або на астравах, што адносяцца да іх… не павінны ўвозіцца ці дастаўляцца ў Англійскую рэспубліку, або ў Ірландыю, або ў нейкія землі, астравы, плантацыі і тэрыторыі, якія належаць гэтай рэспубліцы або знаходзяцца ў яе ўладанні, ні на якім іншым караблі, судне або суднах, апроч тых, якія сапраўды і без падману належаць толькі грамадзянам гэтай рэспублікі або яе калоній як уласнікам або правадзейным уладальнікам, і капітан і матросы якіх таксама будуць грамадзянамі гэтай рэспублікі; пад страхам канфіскацыі і страты ўсіх тавараў, якія будуць увозіцца насуперак гэтаму акту, а таксама пад страхам канфіскацыі карабля (са ўсім яго рыштункам, гарматамі і прыладамі), на якім будуць дастаўлены або ўвезены названыя тавары або прадукты; палова канфіскаванага пойдзе на карысць рэспублікі, а другая — на карысць усякай асобы або асоб, якія захопяць тавары або прадукты і будуць адстойваць свае правы ў будзь-якім прызавым судзе рэспублікі.

*1. Якія абмежаванні ўводзіліся на ўвоз каланіяльных тавараў?*
*2. Што прымусіла Англію прыняць гэты закон?*
*3. Як называецца падобная палітыка?*

Напрыканцы XVII ст., падчас праўлення Людовіка XIV, узмацніла сваю каланіяльную экспансію Францыя. Ад гэтага часу і аж да пачатку XIX ст. барацьбу за панаванне на сусветных гандлёвых шляхах і ў калоніях вялі пераважна Англія (Вялікабрытанія) і Францыя. Арэнай іх сутыкненняў былі галоўным чынам Паўночная Амерыка і Індыя.

### ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Важную ролю ў гісторыі сусветнага гандлю і фінансавай сістэмы адыгралі біржы. Першая спецыялізаваная таварна-фінансавая біржа з'явілася ў Антверпене. Яна была заснаваная ў 1531 г. і хутка ператварылася ў цэнтр фінансавай актыўнасці Еўропы. На біржы гандлявалі самымі рознымі таварамі — ад спецый да каштоўных металаў. Гэта рабіла яе надзвычай важным месцам заключэння здзелак паміж купцамі з розных краін.



У канцы XVI ст. Антверпен страціў сваё пануючае становішча пасля аблогі іспанскімі войскамі (1584–1585 гг.) падчас Нідэрландскай рэвалюцыі. Многія купцы і банкіры пераехалі ў іншыя гарады, у тым ліку ў Амстэрдам.

*Скарыстайцеся дадатковымі крыніцамі інфармацыі, параўнайце Антверпенскую біржу XVI ст. і Беларускую ўніверсальную таварную біржу XXI ст. паводле самастойна абраных крытэрыяў.*

**2. Уцягнутасць рэгіёна Усходняй Еўропы ў міжнародны гандаль у ранні Новы час.** У ранні Новы час Усходняя Еўропа адыгрывала важную, але своеасаблівую ролю ў міжнародным гандлі. У адрозненне ад Заходняй Еўропы, дзе пераважалі прамысловыя тавары і каланіяльныя прадукты, усходнееўрапейскія краіны (Рэч Паспалітая, Расія, Венгрыя і інш.) выступалі пераважна як пастаўшчыкі сыравіны і сельскагаспадарчай прадукцыі. Іх гандаль быў шчыльна звязаны з эканамічнымі патрэбамі больш развітых заходніх дзяржаў.

Геаграфічна Усходняя Еўропа знаходзілася воддаль ад асноўных гандлёвых шляхоў, якія злучалі Заходнюю Еўропу з амерыканскімі калоніямі, з Індыяй і Далёкім Усходам. Адным са значных напрамкаў гандлю для Усходняй Еўропы быў Балтыйскі рэгіён. Парты Гданьска, Рыгі і Рэвеля (Таліна), пазней Санкт-Пецярбурга выконвалі ролю важных пунктаў, праз якія ажыццяўляўся экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі, лесу і некаторых прамысловых тавараў у Паўночную Еўропу.

Чарнаморскі басейн таксама меў важнае значэнне для ўсходняй часткі Еўропы, асабліва для тых абласцей, якія былі пад кантролем Асманскай імперыі. Праз Чорнае мора тавары рухаліся паміж Усходняй Еўропай і Турцыяй, але гэтыя адносіны не аказвалі істотнага ўплыву на агульную структуру міжнароднага гандлю.

У цэлым удзел Усходняй Еўропы ў міжнародным гандлі заставаўся абмежаваным у параўнанні з Заходняй Еўропай. Асноўнай прычынай гэтага была слабасць мясцовага вытворчага сектара, які не мог прапанаваць канкурэнтаздольныя прамысловыя тавары на міжнародным рынку. У адрозненне ад заходніх краін, дзе развіваліся мануфактуры і рабіліся высакаякасныя вырабы, усходнееўрапейскія дзяржавы працягвалі заставацца пастаўшчыкамі сельскагаспадарчых прадуктаў і сыравіны. Гэтая залежнасць ад заходнееўрапейскага рынку паспрыяла кансервацыі феадальных парадкаў (асабліва прыгоннага права) і запаволіла прамысловае развіццё рэгіёна. Тым не менш гандлёвыя сувязі падрыхтавалі глебу для будучых эканамічных змен у XVIII–XIX стст.

Параўнайце ролю Усходняй і Заходняй Еўропы ў міжнародным гандлі ранняга Новага часу. У чым заключаліся асноўныя адрозненні?